Раскол камуністаў магчымы, але не сёння (стар. 2)
У бой ідуць «чаўнакі» (стар. 3)

СВАБОДА

Год заснавання 1902
Выходзіць з 1990
Галоўны рэдактар Ігар Гермянчук
Заснавальнік і выдавец Павел Жук
Наклад 41.650
Адрас рэдакцыі:
220088, Мінск, вул.Іванаўская, 56
Тэл./факс 362441

27 жніўня 1996 г. № 64 Кошт свабодны

Пазьняк і Навумчык застаюцца ў Штатах

У мінулую пятніцу, 23 жніўня, іміграцыйныя службы ЗША прадаставілі палітычны прытулак на неабмежаваны тэрмін лідэру Беларускага народнага фронту Зянону Пазьняку і прэс-сакратару БНФ Сяргею Навумчыку.



У лісце, накіраваным на імя З.Пазьняка і С.Навумчыка, дырэктар Службы іміграцыі і натуралізацыі ЗША Джозэф Марцін, у прыватнасці, піша: «Устаноўлена, што вы маеце падставы баяцца палітычных праследаванняў у выпадку вашага вяртання на Радзіму».

Усе ўплывовыя інфармацыйныя агенцтвы свету адзначаюць, што пасля скасавання СССР у 1991 годзе гэта першы выпадак, калі грамадзянам постсавецкай дзяржавы даецца прытулак у ЗША з прычыны палітычных праследаванняў.

Нагадаем, што З.Пазьняк і С.Навумчык пакінулі Беларусь у сакавіку — пасля таго, як улады аддалі сакрэтны загад аб затрыманні і арышце кіраўнікоў БНФ. У ЗША яны знаходзяцца з 7 ліпеня, 30 ліпеня звярнуліся ў іміграцыйную службу Злучаных Штатаў з просьбай аб палітычным прытулку. Як паведамляе «Радыё Свабода», у пачатку жніўня, падчас субяседавання з З.Пазьняком і С.Навумчыкам у Дзярждэпартаменце, афіцыйны прадстаўнік знешнепалітычнага ведамства ЗША Нікалас Бэрнс заявіў, што Вашынгтон вельмі ўстрывожаны парушэннямі праву чалавека ў Беларусі. Асаблівую занепакоенасць ЗША, адзначыў Бэрнс, выклікаюць уведзеныя ўладамі новыя абмежаванні на свабоду слова і сходаў.

За З.Пазьняка і С.Навумчыка хадайнічаў кангрэсмен ад Рэспубліканскай партыі Марцін Хоўк, выбарчая акруга якога знаходзіцца ў штаце Агайо, дзе жыве шмат беларусаў. 23 жніўня, як паведаміла *Associated Press*, М.Хоўк даў прэс-канферэнцыю, на якой заявіў, што будзе настойваць на правядзенні ў Кангрэсе слуханняў, прысвечаных палітычным праследаванням у Беларусі.

«Прадастаўленне палітычнага прытулку Пазьняку і Навумчыку яшчэ раз сведчыць, што ў Беларусі пануе дыктатарскі рэжым», — так пракаментаваў рашэнне амерыканскіх іміграцыйных уладаў адказны сакратар управы БНФ Вячаслаў Сіўчык на прэс-канферэнцыі, якая адбылася ўчора (у панядзелак) у штаб-кватэры БНФ. Ён сказаў, што ўпершыню на такім высокім узроўні прызнана, што ў Беларусі парушаюцца правы чалавека. Такім чынам, лічыць В.Сіўчык, апазіцыя атрымала міжнародную падтрымку ў барацьбе супраць рэжыму Лукашэнкі. Акрамя таго, заявіў ён, рашэнне аб палітычным прытулку цалкам перакрэслівае той надуманы імідж Лукашэнкі-рэфарматара, які ён так настырна імкнецца навязаць Захаду.

Апошні таму прыклад — нядаўняе інтэрв'ю агенцтву *Associated Press*, дзе Аляксандр Лукашэнка заявіў, што лідэру БНФ у Беларусі не пагражае аніякая небяспека і ён гарантуе, што «ні адзін волас не ўпадзе з галавы Зянона Пазьняка». Па словах Вячаслава Сіўчыка, гарантыі і абяцанкі Лукашэнкі не вартыя і выедзенага яйка. «Дастаткова прыгадаць, — гаворыць ён, — абяцанні прэзідэнта запусціць заводы, даць свабоду прэсе, пасадзіць у турму карупцыянераў або паказаць відэастужку аб збіцці дэпутатаў парламента 12 склікання, якія ён не выканаў». «Хто хоча верыць у прэзідэнцкую хлусню — хай верыць. Мы ж упэўненыя ў тым, што калі б Пазьняк своечасова не з'ехаў за мяжу, ён даўно ўжо сядзеў бы за кратамі», — заявіў Сіўчык.

Сакратар управы БНФ таксама абвергнуў меркаванне Лукашэнкі, выказанае ім журналістам *Associated Press*, што «эміграцыя Пазьняка — гэта спосаб апазіцыі прыгожа адхіліць лідэра, які страціў аўтарытэт». Наконт гэтага Сіўчык адназначна заявіў: «Калі ў Беларусі ўдасца хоць мінімальна забяспечыць дэмакратыю (а гэта здарыцца, калі Лукашэнка пойдзе ў адстаўку, што непазбежна), Пазьняк як лідэр вернецца на Бацькаўшчыну».

Сіўчык таксама лічыць, што ставіць крыж на Пазьняку як палітычным лідэры — гэта чарговая памылка тых людзей, якія сёння занялі пасіўную пазіцыю і чакаюць, што будзе далей.

Віктар ВАЛАДАШЧУК

У Кангрэсе ЗША чакаюцца слуханні

Канцылярыя дэпутата кангрэса ЗША Марціна Хоўка распаўсюдзіла 23 жніўня прэс-рэліз з нагоды прадастаўлення З.Пазьняку і С.Навумчыку бестэрміновага палітычнага прытулку ў ЗША.

«Я быў упэўнены, што пры цяперашняй сітуацыі ім будзе прадастаўлены прытулак, — заявіў М.Хоўк. — Спадзяюся, гэтае рашэнне выразна адлюстроўвае пазіцыю Дзярждэпартамента ў адносінах да таталітарнага рэжыму сталінскага тыпу, які, на жаль, усталяваўся ў Беларусі».

Як паведамляецца ў прэс-рэлізе, кангрэсмен Хоўк будзе настойваць, каб сітуацыя ў Беларусі стала тэмай спецыяльных слуханняў у Камісіі па міжнародных зносінах. М.Хоўк ужо накіраваў старшыні гэтай камісіі Кангрэса Б.Джылману ліст, у якім заклікае правесці слуханні ў самы бліжэйшы час.

Акрамя таго, гаворыцца ў дакуменце, М.Хоўк абяцае прыкласці ўсе намаганні, каб беларускія лідэры і іх сем'і змаглі зноў быць разам на зямлі ЗША.

М.Н.

Падпішыся на СВАБОДУ — будзеш заўсёды ў курсе

Падпісная кампанія на IV квартал хутка завершыцца! Газету СВАБОДА можна выпісаць у любым аддзяленні сувязі і «Белсаюздруку».

Кошт падпіскі:
на месяц — 10 тыс. руб.
на квартал — 30 тыс. руб.

Ці заявіць «сямёрка» ультыматум?

Што думаюць пра «круглы стол» яго ўдзельнікі

Перспектыва «круглага стала» выглядае пакуль не вельмі аптымістычна, аднак некаторыя палітыкі не губляюць надзеі на поспех аб'яднаных дзеянняў у абарону сённяшняй Канстытуцыі

На гэтым тыдні «круглы стол» збярэцца другі раз. Ці будзе вынік больш значным? Гэтае пытанне хвалюе тую частка грамадства, якая спадзяецца на «кс» як на апошнюю магчымасць ўратаваць краіну ад дыктатуры адной асобы.

Ацэньваючы вынікі першага паседжання «круглага стала», спікер ВС **Сямён Шарэцкі** адзначыў як самае істотнае той факт, што да перамоваў удалося далучыць палітычныя сілы, якія яшчэ зусім нядаўна на дух не пераносілі адна другую. Сапраўды, лідэры Народнага фронту і ПКБ прадэманстравалі якасна новы ўзровень узаемаадносін як з іншымі партыямі, так і паміж сабою. Найбольш палярныя палітычныя арганізацыі аказаліся здольныя весці канкрэтны дыялог і лёгка знайшлі тое, што іх аб'ядноўвае, — агульны клопат пра захаванне законнасці. На думку Шарэцкага, калі ўдасца захаваць гэты стыль адносін і надалей, то палітычныя вынікі рана ці позна з'явяцца, бо нашае законапаслухмянае грамадства не можа не ацаніць упартыя пошукі кампрамісу.

Лідэр Грамадзянскай партыі **Станіслаў Багданкевіч** лічыць, што трэба дзейнічаць больш рашуча: «Мы будзем настойваць на ўключэнні ў заяву «круглага стала» ультыматума прэзідэнту: альбо ён вяртаецца на канстытуцыйнае поле, альбо мы пачынаем працэдуру імпічменту». На думку старшыні АГП, адных патрабаванняў прытрымлівацца законаў мала, бо сёння, калі прэзідэнт штампуе незаконныя ўказы і прымушае ўсіх ім падпарадкоўвацца, вельмі лёгка заблытаць грамадскасць (маўляў, гэта яны не прытрымліваюцца законаў). Акрамя таго, лічыць Багданкевіч, трэба прымусіць прэзідэнта пайсці на рашучае рэфармаванне і эканомікі (ў бок раздзяржаўлення), і мясцовай ўлады (у бок яе выбарнасці), і іншых сфераў. Дзеля гэтага варта аб'яднацца палітычным арганізацыям і стаць ініцыятарамі свайго рэферэндуму. Магчыма, нават не праз парламент, а шляхам збору подпісаў сярод насельніцтва, што атрымае, бясспрэчна, вялікі рэзананс у грамадстве. У гэтым сэнсе «круглы стол» — ужо гатовы штаб для арганізацыі такіх ініцыятыў. З іншага боку, Багданкевіч бачыць небяспеку таго, што «кс» ператворыцца ў рэгулярныя канферэнцыі, падчас якіх будзе фіксаваць, што становішча, стала яшчэ горш. Сэнсу ў такіх форумах лідэр АГП не бачыць: «Хай лепш нас разгоняць і ўсіх адправяць на стадыён. Навошта прымаць рэзалюцыі, на якія ніхто не звяртае ўвагі. Выбаршчыкі галасавалі за нас дзеля таго, каб мы спрыялі паляпшэнню становішча і таму трэба дзейнічаць», — упэўнены Станіслаў Багданкевіч.

З сумневам ацэньвае перспектывы «круглага стала» і лідэр Партыі працы дэпутат **Аляксандр Бухвостаў**. Ён таксама падзяляе думку, што станоўчы вынік «кс» атрымае толькі тады, калі ўлада ўбачыць імкненне дзейнічаць рашуча. Нездарма падчас абмеркавання праекта першага пагаднення Бухвостаў нават заявіў, што не бачыць сэнсу падпісваць гэтую паперу, калі пад ёй не стаіць подпіс прэзідэнта. Свой аўтограф прафсаюзны лідэр усё ж паставіў, аднак адвочна, што менавіта ён можа быць першым, хто пакіне свой сегмент «круглага стала», калі дзейнасць яго пачне нагадваць звычайную палітычную тусоўку.

Найбольш канкрэтна вызначыў свае пажаданні «кругламу сталу» лідэр Свабоднага прафсаюза **Генадзь Быкаў**. Ён прапаноўвае наступнае. Не чакаючы, пакуль дзяржаўныя СМІ звернуць увагу на дзейнасць «кс», распачаць сваю прапагандысцкую кампанію. Партыі-«падпісанты» павінны праводзіць яе праз свае мясцовыя арганізацыі і органы друку. На яго думку, трэба нават вярнуцца да практыкі распаўсюджвання ўлётак, у якіх растлумачыць людзям пазіцыю «кс». Сумеснымі намаганнямі можна надрукаваць і распаўсюдзіць такіх ўлётак дастаткова, лічыць Генадзь Быкаў. А дасягнуць міжнароднага рэзанансу гэтай барацьбы можна з дапамогай шматлікіх сувязяў з прафсаюзнымі і палітычнымі арганізацыямі свету. Ну і, нарэшце, кожнай акцыі ўладаў павінна процістаўляцца контракцыя.

(Працяг на стар. 2)

ТОЧКА ЗРЕНИЯ

Сколько можно издеваться над народом?

Предложения президента по содержанию вопросов референдума, направленные Верховному Совету, грубо оскорбляют и представительный орган власти, и весь народ Беларуси. Это больше чем цинизм. Все хорошо понимают, что этот «сыр-бор» разведен ради главного вопроса, касающегося изменений в Конституции, цель которого: добиться неограниченных полномочий президенту. Зачем? Глава государства вышел из своего правового пространства и стал «гулять» по всему правовому полю государства. Это 15 раз подтверждал Конституционный суд. А ведь за это раньше или позже придется отвечать. Значит — надо расширить свои полномочия. И то, что сделано незаконно, волей народа сделать законным.

Поэтому сейчас все «президентские» и «вертикальные» средства массовой информации оголтело, отдавая значительную площадь газетных полос и эфирного времени, стали обрабатывать народ, общественное мнение в поддержку референдума. Но ведь никто не знает содержания главного вопроса. Где, спрашивается, честь и достоинство тех журналистов, ученых, политологов, которые агитируют людей поддержать «кота в мешке»? Неужели они считают наш народ настолько необразованным, что его очень просто ввести в заблуждение, обмануть? Не надейтесь на это, господа!

Георгий ТАРАЗЕВИЧ

НА ГЭТЫМ ТЫДНІ

Мінскі гарадскі суд прызначыў на 29 жніўня судовы працэс над украінскімі грамадзянамі, арыштаванымі ў Мінску 26 красавіка. У гарадскім судзе лічаць, што «няма чаго цягнуць, людзі ж сядзяць». Імя суддзі, які будзе разглядаць справу, пакуль не паведамілі, але сказалі, што ён «вывучае справу днём і ноччу», каб паспець да прызначанага тэрміну.

Алесь ДАШЧЫНСКІ

© PDF: Kamunikat.org 2010
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Ці заявіць «сямёрка» ультыматум?

(Пачатак на стар. 1)

Напрыклад, калі ўлады збіраюцца праводзіць так званы нацыянальны кангрэс — няхай яго сустрэне мітынг некалькіх дзесяткаў пратэстуючых, прапаноўвае Генадзь Быкаў.

Выконваючы абавязкі старшыні БНФ **Лявон Баршчэўскі** ў сваім каментары быў больш лаканічны і песімістычны. На ягоную думку, у апазіцыі засталося адзін-два тыдні, каб прадэманстраваць стаўленне да рэферэндуму і новага ўзору канстытуцыі. Але больш чым на гэты тэрмін разлічваць не даводзіцца. Калі за гэты час выканаўчай уладзе не будзе прадэманстравана аб'яднаная воля ўсіх партый — іх існаванне ўвогуле акажацца пад пагрозай. Што тычыцца рэферэндуму, то Лявон Баршчэўскі падкрэслівае: «Гэта небяспечныя гульні. Прышпіліць да пытанняў прэзідэнта свае хутчэй за ўсё не атрымаецца. Праводзіць услед за прэзідэнцкім свой рэферэндум ужо не будзе мець сэнсу. Таму, мне здаецца, што лепшае выйсце — байкот рэферэндуму. Аднак канчаткова з гэтым пытаннем мы яшчэ не вызначыліся. Трэба думаць.»

У панядзелак, калі друкаваўся гэты нумар газеты, адбылося чарговае пасяджэнне аргкамітэта «круглага стала». Была падрыхтаваная палітычная заява, падпісанне якой, як чакаецца, адбудзецца ў сераду.

Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ

Раскол коммунистов возможен, но не сегодня

Очередное определяющее жизнь страны событие приближается с неотвратимостью бульдозера, сорвавшегося с горы. Пожалуй, ничто и никто не помешает состояться референдуму, объявленному «руководителем республики». Нового, президентского, варианта Конституции еще не видел никто, но многие его уже поддерживают. В первую очередь — ветераны, вернее советы ветеранов, взявшие на себя нелегкие обязанности выражать мысли и чаяния всех пожилых людей страны. Или почти всех. По их глубокому убеждению, референдум *«будет способствовать стабилизации экономического положения в нашем государстве, сплочению всех прогрессивных сил белорусского народа в борьбе за улучшение жизни, за поддержку внутренней и внешней политики, которую проводит руководитель нашей республики А.Г.Лукашенко»*.

«Геронтологической» части общества, разумеется, уже только в силу естественных причин трудно адекватно оценить происходящее. Привычка не просто жить, а жить и бороться, причем исключительно на стороне власти, закреплена на генетическом уровне, и изменить ее просто невозможно. Это обстоятельство традиционно успешно используют политики, манипулирующие наивными стариками с поразительными простотой и цинизмом.

Поспешили «лечь» под президента многие мелкие и малоизвестные организации: от различных советских «патриотов» до экзотических «ученых социалистической ориентации».

Из более-менее значимых политических партий пока только Либерально-демократическая партия Республики Беларусь открыто поддержала политику А.Лукашенко и приготовилась к *«совместному сотрудничеству в органах исполнительной власти»*. Поддержка Лукашенко белорусским филиалом ЛДПР, вероятно, не окажет медвежью услугу президенту, хотя можно было бы предположить, что в республике, пережившей нацистский ад, нет сторонников партии, которую на родине ее основателя совсем недавно многие считали фашистской. После того, как большинство нашего населения спокойно проглотило высказывания своего кумира о полезности гитлеровского режима в деле установления порядка, — возможно все.

Наиболее интересна позиция самой многочисленной и этим сильной партии Беларуси. Как известно, первый секретарь ЦК Партии коммунистов поставил свою подпись под антипрезидентским Обращением руководителей семи политических партий. Кроме того, в некоторых СМИ опубликоваано довольно интересное и еще более антипрезидентское сочинение другого лидера ПКБ — В.Новикова. Но президентской вертикали без труда удалось организовать имеющий совершенно противоположную тональность дружный и громкий голос коммунистов «с мест». Вот яркая иллюстрация — материалы пресс-группы Гомельского обкома ПКБ. Как по команде, *«большинство коммунистов»* Гомельщины в спешном порядке принялось высказывать *«негативное отношение к Обращению руководителей политических партий ко всем гражданам Республики Беларусь»*. Рядовые члены партии, если верить опубликованному партийному документу, серьезно обижены на свой ЦК из-за отсутствия предварительного обсуждения в местных партийных комитетах такого важного шага, как «заброска камня» в президентский огород. Это, по мнению некоторых крупных партийных организаций, привело к тому, что были проявлены *«поспешность ЦК и однобокий подход в анализе ситуации»*, что *«негативным образом сказалось при подписании Обращения руководителями семи политических партий»*. Но самое страшное, конечно, заключается в том, что *«не была дана оценка роли правых националистических сил в ухудшении социально-экономического положения в республике»*. Ведь любому настоящему коммунисту ясно, что *«руководители партий правой ориентации»* актом подписания Обращения *хотят коварным образом «снять с себя ответственность за глубокий кризис и перенести всю тяжесть вины на Президента республики А.Г.Лукашенко»*. Но при всем этом гомельские коммунисты напрочь отвергли *«утверждения буржуазной прессы о якобы имеющемся расколе в партии»*. Бюро областного комитета ПКБ лишь *«признало и заявило, что участие первого секретаря ЦК в подписании совместного заявления является ошибочным»*.

Действительно, вряд ли разногласия в ПКБ по поводу подписания С.Калякиным крамольного Обращения внесут очень сильный раскол в ее ряды, и тем более рано надеяться, что «призрак коммунизма покидает границы бывшего СССР». Коммунистическая идея — идея безнаказанного дележа чужой собственности — особенно сильна в нашей республике, она действительно овладела массами, и настоящие коммунисты будут использовать ее еще достаточно долго. А товарищ В.Новиков скромничает по поводу количества коммунистов. Возможно, с билетами их, действительно, 20 тысяч, но фактически приверженцами партийной программы ПКБ являются сотни тысяч жителей Беларуси. Кроме того, большинство чиновников президентской вертикали — выходцы из партноменклатуры, не изменившие свои повадки (убеждений у них никогда не было), т.е. негласные члены компартии и ее фактические, а не номинальные лидеры, пусть и не имеющие партбилетов нового образца. Именно они имеют реальную власть на местах, деньги, средства массовой информации. Партийную структуру, помогающую сохранять существующее положение, выпускать из рук эти люди не собираются.

Так что не стоит обольщаться по поводу совпадения взглядов на воинствующее хамство нынешней власти лидеров правых и левых. Последние могут легко быть выброшены «из рядов» настоящими хозяевами коммунистических тел и душ. Коммунистический лидер, начавший говорить правду, не сможет осуществлять руководство другими ленинцами. Возможно, будет проведена и небольшая оперативная «чистка» среди рядовых членов.

Если же случится чудо и компартия в своем большинстве действительно выступит против установления в республике президентской манархии и перехватит в этом инициативу, то демократию и демократов подстерегает новая серьезная опасность. Вспомним, как яростно боролись они весной и летом 1994 года с Кебичем, невольно расчищая дорогу нынешнему режиму. Замена А.Лукашенко коммунистами также едва ли будет лучшим вариантом для Беларуси.

Юрий ВОРОНЕЖЦЕВ

Вертыкаль баіцца выносіць смецце з хаты

Карэспандэнта СВАБОДЫ не пусцілі на нараду ў аблвыканкаме

Днямі ў Гродне павінен быў адбыцца інструктаж вертыкальшчыкаў з усёй вобласці пра тое, як выйграць рэферэндум. Невераготная рэч: чыноўнікі марна чакалі ажно паўтары гадзіны, а інструктаж так і не пачаўся — чыноўнікаў распусцілі на абед.

Рэч у тым, што старшыня аблвыканкама А.Дубко вырашыў спачатку «нейтралізаваць» дэпутатаў Вярхоўнага Савета ад Гродзенскай вобласці, якіх сабраў у сябе. А.Дубко спадзяваўся «ўламаць» дэпутатаў за 30 хвілін, але спрэчкі расцягнуліся на 2 гадзіны. І гэта пры тым, што спецыяльна не запрашалі двух дэпутатаў членаў Прэзідыума ВС — гродзенцаў С.Домаша і М.Гіруця. Апошні, праўда, неяк даведаўся аб засакрэчанай сустрэчы і прыйшоў на яе сам, а ўжо выгнаць яго не адважыліся.

Затое выгналі журналістаў. Такое здарылася ўпершыню! Карэспандэнта недзяржаўнай газеты «Инфо-биржа» М.Карневіча аблвыканкамаўскія чыноўнікі схапілі за рукі, калі ён толькі зазірнуў у залу. Калі карэспандэнт СВАБОДЫ запатрабаў ад чыноўніка, які кіраваў акцыяй, не парушаць Закон аб друку і прапусціць журналістаў у залу, той адпарыраваў: «А вы — з незалежнай прэсы». З гэтага яўна вынікала, што правы мае толькі «залежная» прэса.

Чыноўнік вельмі нерваваўся і паводзіў сябе досыць агрэсіўна. Ён кінуўся па дапамогу да дзяжурнага міліцыянта. І гэта вельмі абуральна: аказваецца, любы клерк можа камандаваць супрацоўнікам міліцыі і нават нацкаваць яго на прыстойных людзей. Вось так неўпрыкмет і пачынаецца беззаконне, падумалася мне.

Давялося нам шукаць справядлівасці ў самога старшыні аблвыканкама А.Дубко, які кіраваўся на інструктаж. Ён нас за рукі не хапаў, але пускаць у залу таксама забаяўся. «Мы павінны паведамляць чытачам пра ўсё, у тым ліку і пра тое, як вы рыхтуецеся праводзіць рэферэндум», — паспрабаваў растлумачыць яму я. Ён жа мне адказаў, што калі пра ўсё паведамляць, дык будзе Бог ведае што. Вельмі шчыра! На пытанне: «Дык вы нам забараняеце прысутнічаць у зале?» — А.Дубко адказаў двойчы: «Я так не сказаў, але ў нас рабочая нарада, будзем абмяркоўваць узаемаадносіны паміж вертыкаллю і Саветамі». Дарэмна сп.Дубко паспрабаваў нас увесці ў зман.

Цікавая акалічнасць: заўзята «ачышчаў» залу ад журналістаў не хто іншы, як сам «галоўны інструктар» — дакладчык М.Прысада. Раней у абкаме КПБ ён працаваў намеснікам загадчыка арганізацыйнага аддзела, цяпер знаходзіцца на аналагічнай пасадзе ў аблвыканкаме. А вось у партыйнай кар'еры сп.Прысады нават адбыўся некаторы зрух — ён вырас да сакратара гаркама ПКБ.

Відаць, сп.Прысада ўсведамляў палітычную цынічнасць інструктажу, а таму і не хацеў, каб пра ягоны даклад даведаліся чытачы СВАБОДЫ. Як вынікае з «інструкцый», галоўная задача вертыкалі — «станоўчы вынік рэферэндуму, што, у сваю чаргу, павінна стаць народным «вотумам даверу прэзідэнту».

М.Прысада пацвердзіў тое, пра што «здагадваліся» многія: перад рэферэндумам, каб незадаволеныя перайшлі ў катэгорыю шчаслівых і ўдзячных, трэба выплаціць зарплаты, стыпендыі, пенсіі. Такую важную кампанію неабходна таксама забяспечыць арганізацыйна, таму ставіцца задача «ва ўсіх без выключэння» працоўных калектывах стварыць рабочыя групы па падрыхтоўцы да рэферэндуму, а пры іх, у сваю чаргу, яшчэ адны групы — «грамадскай падтрымкі».

Загадана прааналізаваць выбарчую кампанію 1995 г. і выкарыстаць яе ўрокі. Вертыкаль паспрабуе заігрываць з палітычнымі партыямі, каб прыцягнуць іх на свой бок. Пры гэтым у сваёй хаце будзе чыстка: вертыкальшчыкам, што «настроеныя па-антыпрэзідэнцку», — «прапануюць памяняць працу». Тое ж будзе і з гаспадарчымі кіраўнікамі. Карацей, пажарным парадкам уводзіцца аднадумства, па сутнасці здзяйсняюцца іранічныя прагнозы газетчыкаў наконт праверкі чыноўнікаў з дапамогай дэтэктара ілжы на лаяльнасць прэзідэнту.

Але гэта яшчэ не ўсё. Вертыкалі загадана таксама падрыхтаваць так званы «нацыянальны кангрэс». Аказваецца, чакаюць прэзідэнцкага ўказа (інструкцыі), паводле якога будуць адбывацца выбары дэлегатаў кангрэса! А пакуль указа няма, выканкамы павінны накіраваць у буйныя працоўныя калектывы «куратараў» — дзеля агітацыі.

У аблвыканкаме спехам (да канца жніўня!) ствараецца грамадска-палітычнае ўпраўленне — гэткі абласны палітаддзел. Такія ж аддзелы будуць створаныя і ў райцэнтрах, а разам усё гэта будзе называцца «ідэалагічнай вертыкаллю»!

Збоку неяк дзіўна назіраць, як ва ўсёй гэтай бруднай гульні (што не мае ніякага дачынення да будаўніцтва дэмакратычнай дзяржавы і ўмацавання эканомікі) выкарыстоўваюцца ўвогуле сумленныя людзі са станоўчай рэпутацыяй — накшталт А.Дубко. Але ўсё ўвогуле проста, дастаткова аднаго прыкладу. Нядаўна А.Лукашэнка разам з А.Дубко літаральна на паўгадзіны спыняліся ў калгасе «Азёры» Гродзенскага раёна, якім кіруе сын абласнога вертыкальнага. Тады А.Дубко-сын, дарэчы, дэпутат ВС — папрасіў у прэзідэнта 5 мільярдаў рублёў для свайго калгаса. Лукашэнка сказаў, што дасць 4 — з тых 12 мільярдаў, якія выдзеліў старшыні аблвыканкама на ўсю вобласць. Вядома, без прэзідэнцкай згоды сам бацька такі падарунак для сына зрабіць не наважыўся б. Цяпер прэзідэнт можа быць спакойны за рэферэндум на Гродзеншчыне, хоць гэтыя мільярды зусім не ягоныя асабістыя, а — грошы падаткаплацельшчыкаў.

Сяргей АСТРАЎЦОЎ

РЭЙТЫНГ

Хочаш – вер, хочаш – не

Электарат Лукашэнкі працягвае верыць свайму куміру

Вынікі апытанняў, якія праводзіць сацыялагічная лабараторыя Андрэя Вардамацкага «Новак», сведчаць, што прэзідэнт Лукашэнка мае стабільна высокі працэнт падтрымкі. З гэтых апытанняў таксама вынікае, што электарат Лукашэнкі застаецца нязменным — гэта пераважна людзі з пачатковай адукацыяй (радзей — сярэдняй) ва ўзросце 50—65 год і старэй, жыхары вёсак і невялікіх правінцыйных гарадоў. Тым часам у сталіцы рэйтынг прэзідэнта складае 24,12%. А ў цэлым па Беларусі карціна наступная (гл. табліцу).

Калі б у бліжэйшы час праходзілі новыя выбары прэзідэнта РБ, каго б вы падтрымалі ў першую чаргу?

		Красавік-травень 1996г.	Ліпень 1996г.
	Аляксандр ЛУКАШЭНКА	45,1	46,7
	Станіслаў ШУШКЕВІЧ	6,6	4,6
	Зянон ПАЗЬНЯК	7,1	4,1
	Вячаслаў КЕБІЧ	2,2	2,3
	Станіслаў БАГДАНКЕВІЧ	2,1	1,0

Не ведаю	13,5
Цяжка сказаць	5,7
Ні за каго	2,7
Не буду адказваць	1,1
Няма такіх	1

Апытанне праводзілася па замове «Белорусской деловой газеты».

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

В бой идут «челноки»

Придя в эту среду на минский стадион «Динамо», покупатели могут быть весьма удивлены: продавцы будут стоять на своих рабочих местах, но перед ними не будет товара. Так произойдет, если не изменится решение инициативной группы, созданной предпринимателями для борьбы за отмену недавнего решения горисполкома.

На первый взгляд, столичная мэрия всего лишь ввела вполне нормальную методику взимания налога на прибыль и подоходного налога при реализации товара за наличный расчет через мелкорозничную торговую сеть и магазины с площадью торгового зала не более 25 кв.м на рынках, ярмарках, выставках-продажах. Теперь данные налоги планируется взимать в твердых и фиксированных суммах, выраженных в миллионах рублей в месяц.

Сумма уплачиваемого налога определяется в зависимости от того, какая продукция реализуется, также учитываются обьем торгового оборота и месторасположение торговой точки. Улицы Минска разделены на три категории, и для каждой из категорий ставка будет выше или ниже.

Кроме того, столичные власти решили взыскать налог задним числом. Так, до 1 сентября предприниматели обязаны внести сумму налога за июль-август-сентябрь текущего года.

Платить нечем

На «Динамо», крупнейшем рынке столицы, данная новость произвела неизгладимое впечатление. Состоялись собрания делегатов от всех секторов рынка, и была создана инициативная группа. Как сказал корреспонденту СВАБОДЫ один из членов этой группы, «для нас это равносильно тому, чтобы остаться без куска хлеба, потому что мы должны отдать едва ли не весь свой заработок. Поскольку заплатить мы не можем, мы будем бороться».

Инициативная группа разделилась на две части: одни считают, что надо действовать только юридическими методами, вторые выступают за проведение акций протеста. Пока планируется налоги не платить, а в среду всем, кто торгует на рынке, выйти на работу, но без товара.

Последствия могут быть печальными

СВАБОДА обратилась за комментариями к представителям администрации рынка. На вопрос не связано ли принятое решение с соперничеством между «Динамо», крупнейшим рынком столицы, и рынком в Ждановичах, который стремится прибрать к рукам большую часть мелкой торговли, — руководство рынка «Динамо» ответило, что здесь, похоже, нет связи. Как сообщили администрации рынка в налоговой инспекции, речь в документе идет лишь о городских рынках. Рынок в Малиновке, например, не попадает под действие этого положения. В то же время Ждановичи считаются городским рынком, и данные нововведения на него также распространяются.

Основной недостаток нововведения состоит в том, что от предпринимателей требуют заплатить за предыдущие месяцы. Невозможной представляется и уплата налога до 1 сентября — для этого осталась лишь неделя. Это станет единовременным сильным ударом для предпринимателей, и многие окажутся просто не в состоянии уплатить. К тому же некоторые арендуют несколько рабочих мест, и им придется платить за каждое из них. Не менее важной проблемой (особенно для начинающих предпринимателей) является требование платить налог вперед. Кроме того, не ясно, будут ли учтены те суммы, которые были ранее уплачены в качестве налогов.

Документом не регламентируется ряд спорных ситуаций, которые могут возникнуть при уплате налога. Например, многие предприниматели арендуют места только на субботу или воскресенье, некоторые арендуют по будним дням одно место, по выходным другое. Как это будет учитываться налоговой инспекцией — неизвестно. Остается надеяться, что появятся какие-либо разъясняющие ситуацию документы.

Последствия могут быть печальными и для продавцов, и для покупателей, ибо падение доходов приведет к сокращению рабочих мест (согласно экспертным оценкам, рынок на «Динамо» обеспечивает работой почти 20 тыс. человек). Но самое печальное — произойдет рост цен на товары.

Перспективы

Скандал потихоньку начинает разрастаться. Похоже, что акция протеста будет поддержана другими минскими рынками. В числе наиболее вероятных участников называется Червенский рынок.

В то же время довольно сложно сказать, как будут развиваться события в дальнейшем. С одной стороны, состав мелких предпринимателей весьма неоднороден и им довольно сложно будет объединиться даже для решения своих общих задач. Есть и такие (особенно из числа более богатых), которые считают, что лучше выполнить распоряжения властей и не высовываться. Но они не понимают, что если не окажут сопротивления, то потом их могут заставить заплатить не только за пару прошедших месяцев, но и за год. В то же время, если бы появилась организация мелких предпринимателей, созданная по подобию профсоюза, то она могла бы стать весьма влиятельной и мощной силой.

Обычно у нас недооценивается значение мелкого бизнеса, основанного прежде всего на «челночной» торговле. Слишком дезорганизована эта сфера и, естественно, никак не защищена от произвола со стороны властей. Между тем именно такой бизнес, как считают независимые эксперты, способствует до сих пор сохранению социальной стабильности в обществе, несмотря на крайне низкие официальные доходы населения (доходит до курьезов — согласно этой статистике население уже должно просто вымереть). Остается надеяться, что в ходе последних событий предприниматели осознают и, объединившись, смогут использовать свои потенциальные возможности.

Алесь САДОВСКИЙ

ГІСТОРЫЯ

Калі ж юбілей беларускай чыгункі?

Гэтае пытанне ўзнікла ў мяне, калі на чыгуначным вакзале г.Мінска я ўбачыў вялізны транспарант, а на ім надпіс: «29 лістапада 1996 г. Беларускай чыгунцы — 125 год». Я вырашыў праверыць юбілейную дату і ў выніку атрымаў зусім іншую лічбу — 134 гады!

31 студзеня 1852 г. цар Мікалай I выдаў указ аб будаўніцтве Санкт-Пецярбургска—Варшаўскай чыгункі. З Парыжа былі выкліканы галоўны інжынер шляхоў зносін Францыі Ван Бларэмберг, інжынеры П'яран дэ Мандэснер і Кламіт Грыля. Асноўнай працоўнай сілаю спачатку былі мужыкі з Расіі, якія раней працавалі на будаўніцтве Маскоўска-Пецярбургскай чыгункі і мелі пэўны вопыт. Акрамя таго, у 1852—1853 гадах на будаўніцтве працавалі казённыя (г.зн. дзяржаўныя) сяляне Віленскай, Ковенскай, Гродзенскай і Віцебскай губерняў.

З Ноўгарада везлі рэйкі, з Рыгі — вагоны, з Бранска і Тулы — паравозы. Кастылі для замацавання рэек на шпалах, дробнае чугуннае ліццё выраблялі ў Смаргоні. Пабудавалі чыгуначную станцыю ў Парэчы, а ў 1868 г. узнік вакзал у Гродне (між іншым, у 1986 г. яго зруйнавалі, хоць гэты будынак знаходзіўся ў спісе помнікаў гісторыі і культуры, што знаходзяцца пад аховай дзяржавы). З 1858 па 1861 г. ішло будаўніцтва чыгуначнага палатна ад Гродна да Дынабурга (Дзвінска, цяпер Даўгаўпілс). Беларускі ўчастак Санкт-Пецярбургска—Варшаўскай чыгункі складаў 55 км — ад Кузніцы да Парэчча. Рух цягнікоў пачаўся тут 134 гады назад — у снежні 1862 г.

Другой на Беларусі была Рыга-Арлоўская чыгунка, якая ішла ў Прыбалтыку праз Смаленск і Полацк. Будавалася яна ў 1866—1868гг. Рух цягнікоў на ўчастку Віцебск—Полацк—Дынабург пачаўся ў жніўні—лістападзе 1866 г., або 130 гадоў таму.

Трэцяй чыгункай стала магістраль Смаленск—Мінск—Брэст. Беларуская частка гэтай дарогі ўведзена ў эксплуатацыю 28 (а не 29) лістапада 1871 г. Чамусьці ад гэтай даты вядзецца афіцыйны адлік гісторыі Беларускай чыгункі.

У 1971 г. яна ўрачыста адзначыла свой стогадовы юбілей; відаць, і ў гэтым годзе чыгуначнікі спадзяюцца на юбілейныя віншаванні. Прашу мяне зразумець правільна: я не супраць свята, яго заслугоўвае цяжкая праца чыгуначнікаў, але я за гістарычную праўду. Беларуская чыгунка старэйшая: ёй не 125, а 134 гады. Дык чаму не пачакаць да наступнага года і не адзначыць сапраўдны 135-гадовы юбілей?

Вячаслаў ШВЕД, *дактарант БДУ, Мінск*

Золото Риббентропа

Документ, обнаруженный в национальном архиве США, свидетельствует, что гитлеровский министр иностранных дел Иоахим фон Риббентроп накануне падения Берлина вывез из Германии 15 тонн золота. Большая часть его бесследно исчезла.

Документ представляет собой письмо помощника главного обвинителя на Нюрнбергском процессе Роберта Кемпнеара командованию американских оккупационных войск в Германии. В нем, в частности, говорится, что, очевидно, около половины так называемго «золотого запаса Риббентропа» попала в руки американцев и англичан. Автор письма считает, что часть этого запаса (сейчас такое количество золота оценивалось бы в 250 миллионов долларов) могла оказаться в руках беглых нацистов. Фон Риббентроп, министр иностранных дел третьего рейха, был повешен в декабре 1946 года. Он был самым высокопоставленным функционером нацистской Германии, казненным по приговору Нюрнбергского суда.

В своем письме Кемпнер сообщает, что 6,5 тонны золота было отправлено Риббентропом в его замок в Австрию, и вполне возможно, оно попало в руки американских военных. Две тонны нацист отправил в Шлезвиг-Гольштейн в Германии, и ими, возможно, распорядились британские военные. Другие части золотого запаса были отправлены Риббентропом в последние два года войны в Испанию, Швецию, Швейцарию, Турцию и Португалию. Официально американские войска обнаружили лишь часть золота Риббентропа, спрятанного неподалеку от озера Константин, что в Германии. Однако есть серьезные основания считать, что по крайней мере четыре тонны оказались после войны у бывших нацистов, избежавших наказания.

По данным найденных ранее документов, нацисты в течение всей войны переправили в Швейцарию золота на общую сумму (в нынешних ценах) 4 миллиарда долларов. Были найдены свидетельства тесного взаимодействия нацистских генералов и банковских чиновников Швейцарии. Но задолго до этого, в декабре 1941 года, британское посольство в Вашингтоне предупредило министерство финансов США, что каждый из руководителей третьего рейха и других государств, членов оси, имеет состояние в швейцарских банках.

По одному из документов был найден личный счет Гитлера, на который поступали гонорары от издания его книги «Майн кампф».

Артур СПИГЕЛЬМАН, *Reuter*

Пуцёўку ў жыццё ЖЭС не выдае

Некаторыя жыллёва-эксплуатацыйныя службы г.Мінска пазбаўляюць падлеткаў магчымасці паступаць у ПТВ.

Рэч у тым, што для паступлення ў вучэльню патрабуецца даведка з месца жыхарства, а ЖЭСы адмаўляюцца выдаваць даведкі тым сем'ям, якія маюць запазычанасць па кватрплаце. Пры гэтым чыноўнікі спасылаюцца на пастанову Кабінета міністраў, якой, аднак, такая мера пакарання не прадугледжваецца. Адзін начальнік ЖЭСа сказаў, што на гэты конт «існуе вуснае рашэнне».

Улады дазволілі ў якасці пакарання адключаць даўжнікам ваду, электраэнергію, газ і не прымаць заяўкі на рамонтныя паслугі. Аднак зрабіць гэта тэхнічна няпроста. Нашмат лягчэй пазбавіць чалавека патрэбнай паперкі, без якой у нас, як вядома, нікуды не патыкайся.

Мікола ВАЙТОВІЧ

Мінабароны скінула груз

Адзіная ў Беларусі вайсковая авіябаза цяжкіх транспартных самалётаў, што знаходзілася ў Журжаве пад самым Віцебскам, перастала існаваць.

Нядаўна ва ўрачыстай абстаноўцы быў абвешчаны загад аб яе расфармаванні.

Гэтая вайсковая частка была створаная на базе 339 авіяпалка, сфармаванага падчас вайны ў 1944 годзе. У савецкія часы полк уваходзіў у склад вядомай Віцебскай авіядывізіі, якая неафіцыйна атрымала назву «царскай». Менавіта магутныя самалёты гэтай часткі займаліся перавозам браніраваных аўтамабіляў Брэжнева і Гарбачова падчас іх замежных турнэ.

Пасля знікнення Саюза асноўная частка самай лепшай тэхнікі дасталася, вядома, Расіі. Беларусам пакінулі 30 транспартных самалётаў, але і гэтую колькасць машын дзяржава не здолела ўтрымліваць. Па неафіцыйных звестках, авіябаза штогод «з'ядала» 1/6 частку бюджэту міністэрства абароны. Напрыклад, толькі для таго, каб узляцець, самалёту-волату ІЛ-76 патрэбна 1,5 тоны паліва. З прычыны недахопу авіцыйнай газы амаль спыніліся вучэбныя палёты.

Урэшце было вырашана ўвогуле расфармаваць авіябазу. Усе машыны былі перададзеныя ў карыстанне дзяржаўнай камерцыйнай кампаніі «Трансавіяэкспарт», а экіпажы пераявлі ў штат іншых часцей.

Як паведамілі карэспандэнту СВАБОДЫ ў штабе ваенна-паветраных сіл Беларусі, нерухомасць базы (аэрадром, казармы, гаспадарчыя памяшканні) узяла пад ахову каменданцкая рота.

Віктар ВАЛАДАШЧУК

Сярэдняя зарплата і спажывецкія цэны

Як паведаміла міністэрства статыстыкі, сярэдняя зарплата (налічаная) ў ліпені 1996 г. склала 1.329.853 рублі (у чэрвені яна была 1.271.809 рублёў). У студзені–ліпені 1996 г. зарплата склала ў сярэднім 1.173.136 рублёў.

Між тым з пачатку 1996 года спажывецкія цэны павялічыліся на 19,4%. Толькі ў ліпені ў параўнанні з папярэднім месяцам цэны на харчовыя тавары ўзраслі на 2,4%. Цэны на нехарчовыя тавары ў ліпені павысіліся на 1,6%. Сярод платных паслуг асабліва падаражэлі паслугі пошты — 26,8% і кошты авіябілетаў — на 9%.

Харчы на сметніках

Даведзеныя да мяжы беднасці, некаторыя грамадзяне Магілёва жывяцца літаральна з гарадскіх звалак і сметнікаў.

Туды прадпрымальнікі і гандлёвыя арганізацыі нярэдка звозяць харчовыя тавары, тэрмін спажывання якіх прайшоў. Днямі на прыгарадны жывёламагільнік прывезлі вэнджаную рыбу, якую санітарная служба горада прызнала непрыдатнай для ежы і апрацавала хлорнай вапнай. Аднак на другі дзень амаль усю рыбу расцягнулі людзі. Цяпер застаецца толькі здагадвацца, ці наведвальнікі звалак самі з'ядуць яе, ці паспрабуюць прадаць на рынку.

БелаПАН

Калі вы маеце электронную пошту, то свежы нумар СВАБОДЫ вы можаце чытаць напярэдадні выхаду газеты ў свет.
Кошт электроннай падпіскі ў межах Беларусі — 5 USD у месяц.
Даведкі па тэл. 236-89-40.

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

СВАБОДА
27 жніўня 1996 г., № 64

Прэзідэнцкія куры

Падчас нядаўняга візіту на гродзенскае аб'яднанне «Азот» А.Лукашэнка вучыў рабочых, як жыць, калі не хапае зарплаты.

Рэцэпт быў просты — трэба больш займацца агародам. Аказваецца, у Драздах пад Мінскам, дзе жыве прэзідэнт, у яго самога 30 сотак бульбы. Праўда, яму «столькі не трэба», і ён яе некаму аддае, але каму канкрэтна — не сказаў. Ёсць таксама «цяплічка з памідорамі» — 25 на 15 метраў, якую «паставіў яшчэ Машэраў». А яшчэ — плантацыя памідораў — 30 на 20 метраў, пад адкрытым небам. На жаль, пакуль А.Лукашэнка ездзіў у камандзіроўку ў Маскву, гэтыя памідоры счарнелі.

Ён, аднак, не журыцца, бо бульба і цыбуля на прэзідэнцкім агародзе выраслі проста выдатныя. Прычым А.Лукашэнка прызнаўся, што цыбулю ён ужо сабраў. Прэзідэнт шчодра паабяцаў аднаму з рабочых «пазычыць кропу», паколькі не ведае, што з ім рабіць: кроп «расце як бур'ян». Глава дзяржавы, здаецца, гатовы быў аддаць рабочым і сваю канюшню, якой у яго пасвіна ажно 8 гектараў, але ўжо паабяцаў раней нейкаму калгасу. У А.Лукашэнкі ёсць і сад з галандскай тэхналогіяй — «усё на правадах: толькі пасадзіў яблыню — ужо яблыкі дае». Ёсць і ні многа ні мала 80 кустоў парэчак, плантацыя малін і «кветкі розныя».

Што да жывнасці, дык з гэтым поспехі больш сціплыя. Прэзідэнт мае 19 курэй (праўда, «адна здохла»), а таксама аднаго пеўня. Пабач ёсць возера з рыбай, але — чужое. Таму прэзідэнт спрабаваў развесці ў двары сваю рыбу, але, па яго шчырым прызнанні, «штосьці не атрымліваецца. Дохне. Гавораць, паветра ёй не хапае».

У чытача можа ўзнікнуць заканамернае пытанне: навошта прэзідэнту гэты міні-калгас і няўжо ў яго хапае часу і на рэвізію падручнікаў, і на змаганне з ворагамі, на развядзенне рыбы ды ўборку цыбулі? Аказваецца, прызнаецца Лукашэнка, «потихоньку для ума, для рук — надо работать».

Шкада толькі, што прэзідэнт не патлумачыў, колькі «парабкаў» працуе на ягонай гаспадарцы і што гэта за людзі. А гаспадарка, сапраўды, калі і не памешчыцкая, дык кулацкая. Нездарма ж «бацька» пабойваецца камуністаў: вернуцца да ўлады — раскулачаць.

Уладзімір ІВАНОЎ

ЗДАРЭННІ

Небяспечная аўтамагістраль

Паводле інфармацыі прэс-службы Брэсцкага абласнога ўпраўлення ўнутраных справаў, з пачатку года на аўтамагістралі Брэст–Мінск ў аварыях загінула 6 расійцаў, 7 палякаў, 2 украінцы і 6 грамадзян іншых краін.

Галоўная прычына гібелі іншаземцаў — сон за рулём. Апошні прыклад: днямі на шашы Брэст–Мінск у аўтамабільнай аварыі загінуў 39-гадовы жыхар Масквы Шутаніч. Ён заснуў за рулём сваёй *Toyot'ы*, якую пераганяў з Германіі, і сутыкнуўся з грузавіком. Загінуў і наняты ім 26-гадовы ахоўнік, жыхар Брэста.

Валодзя ЯНЧУК

Караваны нелегалаў ідуць праз Беларусь

Яшчэ адна група іншаземцаў была затрымана нядаўна на тэрыторыі Брэсцкай памежнай заставы.

10 курдаў з Ірана спрабавалі нелегальна перасекчы беларуска-польскую мяжу. Да Заходняга Буга іх даставілі на мікрааўтобусе два жыхары Мінска. У беларускую сталіцу азіяты трапілі з Ірана праз Турцыю і Украіну.

У прэс-службе ўпраўлення памежных войск карэспандэнту СВАБОДЫ паведамілі, што на працягу жніўня гэта ўжо трэцяя «турыстычная» група, якая намагалася нелегальна трапіць на Захад праз Беларусь. 7 жніўня ў Воранаўскім раёне міліцыя высадзіла з «Ікаруса» з літоўскімі нумарамі 57 грамадзян Індыі, а 21 жніўня ў Іўеўскім раёне пры аглядзе салона аўтобуса супрацоўнікі ДАІ выявілі 52 індусаў.

Такім чынам, Беларусь, дзе з усходу і поўдня практычна няма ніякіх межаў, па-ранейшаму застаецца транзітна-перавалачнай базай для нелегальнага пераходу ў Еўропу.

Валодзя ЯНЧУК

Аблава ў начным клубе

У тры гадзіны ночы з 23 на 24 жніўня ў мінскі начны клуб «Рэактар» уварвалася ўзброеная група дужых мужчын у чорных масках.

З крыкам «міліцыя!» яны з дапамогай кулакоў і дубінак паклалі публіку (каля 300 чалавек) на падлогу. Зрабіўшы праверку дакументаў, міліцыянты ганарова сышлі, забраўшы з сабой некалькі «падазроных».

Анатоль МІРСКІ

«Накарміла» кіем

Жыхарка вёскі Лыкава Магілёўскага раёна ледзь не забіла свайго двухгадовага сына за тое, што ён папрасіў есці.

П'яная, яна збіла дзіця палкай і сышла з дому. Жыццё хлопчыку ўратавала суседка, якая выпадкова зайшла ў дом і ўбачыла акрываўленае дзіця. Маці так і не з'явілася, цяпер яе шукае міліцыя. Адміністрацыйная камісія ўзбудзіла справу аб пазбаўленні яе мацярынскіх правоў.

Сымон ГЛАЗШТЭЙН

ЭКОЛОГИЯ
Турфирма «Экология» рада помочь вам приятно провести отдых.

ШТО ПІШУЦЬ

Лукашэнка пра сваю маці

Як паведаміла газета *«Пагоня»*, прэзідэнт А.Лукашэнка на сустрэчы з калгаснікамі ў Берасцавіцкім раёне Гродзенскай вобласці настойліва раіў сялянам не трымаць грошы пры сабе, а «несці ў прэзідэнцкі банк». Сваю параду ён падмацаваў адмоўным прыкладам сваёй маці: *«У мяне, ведаеце, таксама «варона» сядзіць. 72 гады. Атрымлівае разам з пенсіяй і за малако 800 тысячаў. Але замест таго, каб пакласці іх на «кніжку», — хавае ў панчоху...»*

Алімпійская эканомія

Беларускі ўрад дэманструе неверагодныя поспехі ў справе эканоміі валютных сродкаў. Удалося нават зэканоміць на алімпійскай чэмпіёнцы Кацярыне Хадатовіч. Як піша штотыднёвік *«Свободные новости плюс»*, абяцаныя 40 тысяч долараў за перамогу ў Атланце былі выплачаныя К.Хадатовіч наступным чынам: 10% гэтай сумы ёй выдалі ў Амерыцы доларамі, а астатнія — беларускімі рублямі, ды па курсу НБ (14.400 руб.). Спартсменка фактычна недалічылася трох з паловай тысяч долараў.

СПОРТ

Папоў цяжка паранены

АТЛАНТА: ЗАЛАТЫЯ ЎЗНАГАРОДЫ БЕЛАРУСАЎ

На спартыўных арэнах Атланты завяршыліся X Параалімпійскія гульні. Вельмі удала выступалі там нашыя спартсмены-інваліды. 15 удзельнікаў заваявалі 13 узнагарод: 3 залатыя, 3 срэбныя і 7 бронзавых. Вось імёны алімпійскіх чэмпіёнаў: Алег Шэпель (скачкі ў вышыню — 1,85 м), Ірына Леанцюк (скачкі ў даўжыню — 1,70 м), Тамара Сівакова (штурханне ядра). Заўважым, што Шэпель быў чэмпіёнам і папярэдніх Гульняў у Барселоне, а Леанцюк тут здабыла яшчэ і бронзавы медаль у бегу на 200 метраў. Больш за ўсіх медалёў у нашай камандзе атрымаў Ігар Фартунаў. Пасля двух срэбных — у скачках у даўжыню і трайным — ён стаў яшчэ і бронзавым прызёрам у пяцібор'і. Дзякуй вам, землякі!

Больш за ўсіх узнагарод заваявалі спартсмены Аўстраліі і ЗША.

«ФОРМУЛА-1»: ШУМІ СУЦЯШАЕЦЦА

Чэмпіён свету 1994—95 гадоў у класе аўтагонак «Формула-1» немец Міхаэль Шумахер пасля серыі няўдач на папярэдніх этапах, калі з-за адказу рухавіка яму не ўдавалася закончыць дыстанцыю, нарэшце выйграў. Ён стаў пераможцам чарговага этапа, які праходзіў у Бельгіі, апярэдзіўшы канадца Жака Вільнёва, фіна Міку Хакінена, француза Жана Алезі, лідэра чэмпіянату англічаніна Дэймана Хіла. Хіл, тым не менш, лідзіруе па суме этапаў — 81 ачко. У Вільнёва — 68, Шумахера — 39, Алезі — 38, Хакінена — 23. Да канца чэмпіянату засталося тры гонкі. Дык хто ж, Хіл ці Вільнёў?

ЛЁГКАЯ АТЛЕТЫКА: СУСВЕТНЫЯ РЭКОРДЫ

Бронзавы медаліст Гульняў у Атланце Салах Хісу (Марока) болей чым на 5 секунд палепшыў сусветны рэкорд у бегу на 10.000 метраў, прабегшы гэтую дыстанцыю ў Брусэле за 23.38.08. Таксама, у сталіцы Бельгіі, вызначылася двухразовая алімпійская чэмпіёнка Святлана Масцяркова (Расія). 1.000 метраў яна пераадолела за 2.28,98 — вышэйшае сусветнае дасягненне. Папярэдняя рэкардсменка — Марыя Мутола з Мазамбіка — прайграла Масцярковай больш чатырох метраў — 2.29,66.

Беларус Ігар Астапковіч да апошняй спробы лідзіраваў у кіданні молата з вынікам 80 м 56 см. Аднак перамогу звёў з-пад носу мінчаніна срэбны прызёр Алімпіяды Лэнс Дзіл (ЗША) — 82 м 26 см. Сяргей Алай быў тут шостым. У кіданні дыска пераможцамі алімпійскія чэмпіёны з Германіі Ілке Вілуда і Ларс Рыдэль. Нашы Эліна Зверава і Уладзімір Дуброўшчык — на 2-м і 3-м месцах. Калега Дуброўшчыка Васіль Капцюх — на 6-м месцы.

Чэмпіянат свету сярод юніёраў у Сіднеі (Аўстралія) прынёс агульнакамандную перамогу амерыканцам — 6 залатых медалёў. Да трох з іх мае дачыненне і 17-гадовы Вільям Олбі, на рахунку якога перамогі ў бегу на 400 метраў і ў эстафетах 4 х 100 і 4 х 400 метраў. Нігерыец Асіфа Мегібу выйграў спрынт на 100 і 200 метраў, а Тэрэза Марынава з Балгарыі ўстанавіла сусветнае дасягненне для юніёрак у трайным скачку — 14 м 62 см. У беларусаў два прызавыя месцы — Вадзім Дзевятоўскі з Навапалацка кінуў молат на 70 м 88 см (другі вынік) і Алена Іванenka штурхнула ядро на 16 м 22 см (трэцяе месца).

ВЕЛАСПОРТ: «ТУР ДЭ ФРАНС» ДЛЯ ЖАНЧЫН

І ў жанчын «Тур дэ Франс» карыстаецца рэпутацыяй самай прэстыжнай і цяжкай мнагадзённай велагонкі. Першыя дзевяць этапаў лідзіравала шматразовая пераможца гэтай гонкі алімпійская чэмпіёнка з Францыі Жані Лонга. Аднак затым італьянка Фабіяна Лаперыні пайшла больш чым у пяцімінутны адрыў ад асноўнай групы і ўзначаліла спаборніцтвы. Нягледзячы на перамогу Лонга на 11-м этапе, Лаперыні па-ранейшаму наперадзе, на другім месцы адна з сясцёр Палікявічутэ — Іяланта (Літва), на трэцім — Лонга.

ТЭНІС: ДАТЭ ПЕРАМАГАЕ ІСПАНІЮ

Кіяўлянін Андрэй Мядзведзеў пасля 15-месячнага перапынку зноў стаў пераможцам турніру серыі «Гран-пры». У фінале ў Лонг-Айлендзе (ЗША) ён абыграў чэха Марціна Дама — 7:5, 6:3. Больш моцны састаў удзельнікаў сабраў адкрыты чэмпіянат Канады ў Таронта. І прызавы фонд тут быў салідны — 2 мільёны долараў. У рашаючым матчы знакаміты паўднёваафрыканскі майстар Уэн Ферэйра пераног не менш знакамітага аўстралійскага — Тода Вудбрыджа — 6:2, 6:4. У Сан-Дыега (ЗША) японка Кіміка Датэ ў паўфінале перамагла трэцюю ракетку свету Канчыту Марцінес з Іспаніі — 6:2, 7:5, а ў фінале яе суайчынніцу Аранту Санчэс — 3:6, 6:3, 6:0, якая займае другую прыступку ў сусветным рэйтынгу.

Апошні з чатырох турніраў «Вялікага Шлема» ў бягучым годзе — адкрыты чэмпіянат ЗША. Але яго прапусцяць з-за траўмаў героі папярэдніх: пераможца адкрытага чэмпіянату Аўстраліі Барыс Бекер (Германія), трыумфатар чэмпіянату Францыі Яўген Кафельнікаў (Расія) і яго супернік па парыжскім фінале немец Міхаэль Штых.

ФУТБОЛ: ЖАРАБ'ЁЎКА ЕЎРАКУБКАЎ

У штаб-кватэры *UEFA* ў Цюрыху (Швейцарыя) адбылася жараб'ёўка еўрапейскіх кубкаў турніраў. У Лізе чэмпіёнаў склаліся такія групы.

Група А: «Глазга Рэйнджэрс» (Шатландыя), «Аякс» (Галандыя), «Асер» (Францыя), «Грасхоперс» (Швейцарыя).

Група В: «Відзэў» (Польшча), «Атлетыка» (Іспанія), «Сцяўа» (Румынія), «Барусія» (Дортмунд, Германія).

Група С: «Манчэстэр Юнайтэд» (Англія), «Рапід» (Аўстрыя), «Фенербахчэ» (Турцыя), «Ювентус» (Італія).

Група D: «Порта» (Партугалія), «Гётэборг» (Швецыя), «Русенборг» (Нарвегія), «Мілан» (Італія).

У Кубку *UEFA*, як вядома, з барацьбы выбылі «Дынама» (Мінск) і «Дынама-93», а расійскім клубам жэрабя выбраў наступных сапернікаў: *«Спартак» (Масква) — «Сількеборг» (Данія), ЦСКА — «Феенoорд» (Галандыя), «Дынама» (Масква) — «Рома» (Італія), «Тарпеда-Лужнікі» (Масква) — «Дынама» (Тбілісі, Грузія), «Аланія» (Уладзікаўказ) — «Андэрлехт» (Бельгія).*

У Кубку ўладальнікаў кубкаў, дзе бясслаўна дэбютаваў мазырскі МПКЦ, «Лакматыў» (Масква) сустрэнецца з «Вартэксам» (Харватыя).

НАПАД НА АЛІМПІЙСКАГА ЧЭМПІЁНА

Чатырохразовы пераможца Алімпійскіх гульняў у Барселоне і Атланце ў плаванні на 50 і 100 метраў вольным стылем расіянін Аляксандр Папоў цяжка паранены.

У мінулую суботу каля 23 гадзін ён гуляў па Маскве з дзяўчынай. Нечакана ўзнік канфлікт з прадаўцамі кавуноў, які скончыўся нажавым ударам у жывот алімпійскага чэмпіёна. Нож параніў лёгкія і нырку. Папову была зроблена аперацыя. Ён пры памяці, але стан яго застаецца цяжкім.

Прэм'ер-міністр Расіі Віктар Чарнамырдзін асабіста аддаў указанне аб пачатку расследавання. Адзін з нападаючых затрыманы, саўдзельнікі адшукваюцца.

Апошнія тры гады Папоў жыў і трэніраваўся ў Аўстраліі. У Расію прыязджаў рэдка і ненадоўга. У адным з інтэрв'ю ён скардзіўся на хамства і бязладдзе, якія пануюць у Расіі. Расія яму гэтага не даравала...

Сямён ПЛОЦ

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Хто ж пашкадуе цётак на рынку?

Як ужо паведамлялася, у Бабруйску быў затрыманы 23-гадовы Віктар Шацко, які прадстаўляўся работнікам адміністрацыі прэзідэнта.

Сваю «пасаду» Шацко пачаў выкарыстоўваць у ліпені. У Талачыне ён назваўся прадстаўніком адміністрацыі прэзідэнта і наладзіў «праверку» некалькіх калгасаў і саўгасаў, мясцовага элеватара, рынка. Цікава, што ніякіх пасведчанняў у Віктара Шацко ніхто не пытаўся. Словы «прадстаўнік адміністрацыі» дзейнічалі гіпнатычна. Усе распараджэнні сучаснага Астапа Бэндэра выконваліся адразу і поўнасцю. Напрыклад, Шацко пашкадаваў бабак, якія на рынку гандлявалі малаком з зямлі, і загадаў паставіць для іх прылаўкі. На наступны дзень прылаўкі ўжо былі. Пры праверцы элеватара запрасіў намесніка старшыні выканкама і падатковых інспектараў, разам яны знайшлі парушэнні на 40 мільёнаў рублёў.

Потым ён працягнуў сваю «працу на карысць краіны» ў Бабруйску, вырашыўшы разабрацца з сацыяльнымі ўстановамі горада. Тут ён праверў сход работнікаў мясцовага кінапракату, наведаў некалькі школ горада, запланаваў праведзенне нарады дырэктараў школ Бабруйска і кіраўніцтва аддзела адукацыі. Як казаў потым сам Шацко, калі б не пайшоў ён да мэра Уладзіміра Раманоўскага, які адзіны западозрыў нешта не тое, усё прайшло б нармальна. У далейшых планах Шацко была Гомельшчына.

Па словах затрыманага, ён рабіў усё гэта зусім не дзеля выгады — яе практычна не было. Яму проста падабалася, як самыя вялікія кіраўнікі выцягваліся перад ім і рабілі справаздачы, нават не патрабуючы пасведчання. Праўда, такую-сякую карысць ён усё ж меў: напрыклад, дырэктар талачынскага элеватара добра накарміў «кантралёра».

Сымон ГЛАЗШТЭЙН

Турфирма АКТАМ приглашает:
• БОЛГАРИЯ
дешевый отдых всей семьей (12 дней, авиа, г.Бургас, полупансион, детям — максимальные скидки)
• СЛОВАКИЯ
детский отдых с оздоровлением (15 дней, Низкие Татры, д/о «Лесное озеро»)
Визы в Литву, евровизы
Продажа авиабилетов
Тел. 227-81-65, 259-98-96, 226-04-86

Калі вы жадаеце найвыгадней паказаць свой тавар —
замоўце стэлажы і стойкі ў нас:
тэл. 236-24-41
Еўрапейская якасць!

Падпісны індэкс 63887 E-mail: edit@svaboda.minsk.by © СВАБОДА Спасылка на газету СВАБОДА абавязковая Наклад 41.650
Нумар падпісаны ў друк 26.08.96 (15.00) Надрукавана на паліграфічнай фабрыцы «Чырвоная зорка» (г.Мінск, 1-шы Загарадны завулак, 3) ЛВ № 215 Заказ 265

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010